Ба 160559

Ба 160559

Написаў * * *

* * * Гаўрыла

# Хрест на свабоду

1906.

Бел. аддзел
1994 г.

25. 09. 2009

## Хрэст на свабоду.

На усходзи красна неба.
Нас не дзивяць — так и трэба!
Кроў рэками льецца у мора:
Салдат гине там ад гора.
Без капули и без хлеба.
Нас не дзивиць — так и трэба!

Гоняуц сына, гоняц мужа.
Мы слухаем цара дужа!
З души бьецца скарга у неба.
А мы маучим — так и трэба.
Казак стрэле. Жандар бьецца.
У народу спина гнецца
Ад налогау з соли хлеба
А мы плацим — так і трэба.

У Пецербурху змерли людзи:
Им прашили куляй грудзи,
Бо то з песьняй и з алтарам
Пашли з пацом перед царам.
А цар сыпнуў як бы з неба
Тысяч куляў — так и треба.

Дурняў хрисцинь на свабоду.
Цар навуку даў народу,
Паказаў им як бы з неба,

Што больш цара не патрэба!
Тагды Гапон у грумаду
Бежиць, крычиць — „трэба ладу
Трэба шроту, бомбаў, стрэльбаў,
Трэба биць нам гэтых шельмаў,
Трэ злизаць усих министраў,
Бюрократаў-антыхрыстаў.
Чуго яще голасъ з неба,
Што цара павесиць трэба!“

З той пары Масква, Варшава,
Рыга, Вильна, Бак, Либава,
Беларусь, Литва, Расея
Гонець вон цара зладзея:
Народ чуе голос з неба,
Што больш цара не патрэба.

Бомба трах! Сяргей у шматы
Мирски бежиць аж да хаты.
Цар у страху, сенат млее,
Беданосцаў аж хварэе.

Кладуць сетки, каски бляхи:
Найбольш страшаць гэта ляхи:
Циха коле, цэльне стрэле,
Такек жита гарцей меле.
Народ чуе голас з неба,
Што больш цара не патрэба.

### Небывалые часы.

И песьни зацихлы, и смеху не видна,
И дзеци старэнькими стали.

И ноты веселы музыкам брацъ стыдна;
Радосни струны парвали.
И хварбы артыстаў смутне рысуюць,
И цени ясны змираюць.
И вирши паэты з жалем рымуюць
И серцы кроую сплываюць.

## Мора.

(Революця народна.)

Не такое цяпер мора,
Не таки у хвилях шум:
Цяпер бурна, страшна мора!
Хвиля поўна дзиких дум.

Мора углям цяпер стала,
Мора з дна цяпер гарыць,
Мора скалы пазрывала,
Мора хоче горы змыць.

Мора злуе, крэпнуць хвили,
З дзиким шумам бераг рвуць.
Гром грымиць за вёрсты мили
З мора брызги у неба бьюць.

Месцам хвиля стопам рыкне;
Месцам плач зарвецца з губ,
Месцам бераг болем икне
Гром грымиць у тысяч труб.

Мора збронцца палками.
Шум русалак разбудзиў.
Запалиўся смок агнями.
Неба черны гнеў пакрыў.

Бог серчае: злая бура
Псуе вельми святы сон,
Бьецца рвецца ўся натура,
Аж дрыжиць Небесный трон.

Трон дрыжиць, не сьпяць прароки,
Бог скликае сьвяты сход,
А там радзяць, што аблоки
Мусяць штурм пусциць у ход.

Бой пачаўся. Войска Бога
Залпам палиц ў горды хвиль
Мильён згине нова змога
Расце прэпка праз сто миль.

Растуць силы мора злога,
У размаху видзен гарт;
Не адступяць войску Бога
Бой пачаўся не на жарта.

Таки бой веками ждзецца.
Таки бой гигантаў дасць,
У таком бою тольки грэцца,
У таком бою тольки пасць.

## Добрия весци.

Ах, браце, родны несуцца весьци
Ужо граюць марши там на усходзи.
Над кожнай хатай, у кожном месци
Щабечуць птушки нам а свабодзи.

Усих злучило чароўна слова.
Жалезны обруч скуў нам далонь.
И матка сына дачь нам гатова,
И жонка мужа вышле у агонь.

И дзед старэнки бежиць у дружину,
И унучак следам дзедза спешиць.
Хлопец, абняўши любу дзеўчину,
На барыкадах смела станць.

Ах, браце крэпка сила ў народзи!
Добрыя весци зусюль идуць:
Бо то мильены разам у згодзи.
Далепшай доли смела идуць.

Ах! браце важный мэмэнт приходзиць
Важну ахвяру прыдзецца даць
На неби сонка счасця усходзиць
Тольки патрэба хмары прагнаць.

## Бунтаунин.

Снегу горы. Мароз цисьне,
Аж скрыпяць малые санки;
А Тамаш па сиўцы свисьне
Ды капытам з Муравапки.
Так галёпам прэ да хаты,
Аж у храп нашла кабыла.
Ци не едзе ен у сваты?
Мо сумуе там дзеўчина.
Мо спешиць ён на игрыще?
Но музыкам там играе?
Усё пугай свище, свище,
Усё Сиўку паганяе.
Прилящеўши на падворка,
Сани кинуў, бежиць у хату;
„Выбачай ты мне, свякроўка,
Выбачай и ты мне, тату,
Выбачай и ты, Ганудя,

Жонка мила, серцу люба
Птушка мая, ты зязюля,
Помни, каб тут не тужила
Выбачай сыночак родны,
Што нехрышчаным пакину,
Можа будзеш ты галодны,
Можа будзеш есць мякину,
Можа станеш класьци татку,
Можа камень за мной кинеш,
Мо пачнеш ты лаяць матку...
Бога бойся, а то згинеш.
Бацька любиць цибе вельми,
Не пацешицца да воли.
А што зробиш кали шэльмы
Хочуць хапиць да неволи.
А там могуць не судзиўши
На вероўку да у гору...
Тут Тамаш слезу праливўши
Да праз дзверы да у пору.

## Пад штандарам.

Не плач, матуля?
Не сердуй, татуль!

Што забили Винцуля,
Што не прыдзеа адтуль,
Што чирвоны штандар
Прад народам ён нёс,
Што крычаў: Гасудар,
Ци наеўся ты слез?

Ци напиўся крыви,
Ци накрыўдзиўся нас?

Мы з штандарам прышли:
Разплацицца ўжо час!

Штык далоў! шаблю вон!
Не стрэляй у нас салдат!
Ад прысяги Гапон
Аджагнаў цябе брат!

А тут: „плы“ Закрычаў
Капитан у седли,
И салдат задрыжаў
И даў залп у агни.

Пахиснўся Виндуль,
Штандар цисьне ў руках.
Тут падскочиў патруль
И падняў на штыках

Кали брызгие з грудзей
Кроў гарача дзурком,
Як крапидлам людзэй,
Ахрысцила кругом.

Виндуля на руках
На мячилки несуць;
А трупа у венках,
И у працеси идуць.

И жабрак и салдат
И разъеўшися пан
И жавец пибарак
И сам той капитан.

Челом бье у след трупе,
Вочи поўные слёз,

Прак лыпае сябе,
На сябе непахож.

Я забиў, я пралиў
Пралетарцкую kроў,
Я душу загубиў,
Заплациць я гатоў,

Капитан ашалеў
И атруты узяў.
А народ асилеў,
Штандар у гору падняў.

И нясе и пяе
И мильёны вядзе
На ворога цара
Крэнку руку нясе.

Не прапаў наш Винцуль:
Ен живе серэд нас.
Навернўся патруль,
Прылучиўся у час

И салдат не таки,
Як тагды к' нам стрэляў
Капитан неживы,
Тоб яго не пазнаў.

Неслухняны салдат
Ахвицеру гиркне;
„Я народу сын, брат"
У деманстраци идзе.

На прыказ падаць залп
У чирвоны штандар.

Выстрэл пусцiць ца жарт
У аблокаў алтар.

А народ и нясе
Над штандарам идзе
На варота цара
Крэпку руку нясе.

Нясе доўг у грудзях
На тыранаў цара
И приказ у вачах:
„Цару згинуць пара!"

### Перэд новым годим.

Зегарак бьець, лецяць минюты.
,Дзевяцьсот пяты кончу год.
Хадзу па хаци як атруты,
У жилах чую зимы лёд
З кутоў гледзяць мерноў шкилеты,
На костки плюшиць цёпла кроў
Ах страшны, страшны быў год гэты
Ище страшнейши будзе зноў.
Праз вокна бачу поўна поле:
Старых малых. Ах чую крыки!
Салдат людзей там рэже, коле.
Казак дзяцей падняў на пики.
Ляциць, як вихар матка у болю
Хватае труп малога сына,
А тут и ёй як-раз на долю
Трапляе гострая шрацина.
Бабулю сиву топчуць кони.
Хлапец ляжиць без ног и рук.
Ах льецца кроў праз цэли гони!

Ах Бог вялики, скольки мук!
А там мястэчка запалили,
Рабуюць крамы, бьюць жидоў
И там зноў трупаў навалили,
И там невинну точаць кроў.
Несецца гром з сталиц па краю.
Вяроўки шубениц скрыпяць.
Самодзержаўныхъ гицляў зграю
Народ свабодны хоче змяць.
Сатрап шимиць куляк зладзейски
Засыпаў грошми подлых слух.
Яще паслушны поль грардзейски
Яще у жандараў мае слух.
Яще працуюць чёрны сотвы,
Яще баицца цёмны полк.
Але як выдасць грош свой злотни,
То мусиць будзе дрэнны толк:
Гвар дзсец кине. Жандар здрадзиць,
И чёрна сотня плюне у рот.
Пан Витэ нат пакине радзиць,
Як я развяжиў — добры год!
Як я раздумаў будуць плёны,
Будзе добры уражай!
Бийце у звоны, бийце у звоны!
Новы год народ стрэчай!

### Бура идзе.

Зноў нависли цёмны хмары
Зноў туманы неба крыюць.
Зноў па свеце ходзяцьмары.
Зноў кранчей нам вихры вьюць.

Зноў надходзиць для нас бура;
Зноў маланки бегуць радам.
Зноў шалее ўся натура;
Зноў засыпле свежим градам!

## Лясы.

Вот каб я быў сицилист, дык яще стрельбу
Тоб я так греў: [меў,
Станавых, стражникоў, земских и других са-
А то штож — тольки кулак! [бак!
Прыходзяць сицилисты, писульки прыносяць,
Бунтаваццa просяць.
А каб жеж дали, хаця пораху жменку, писта-
[лет, дубельтаўку,
Аддаў бы апошню залатоўку
За кули и шрот.
Бо так гэты род надаеў! так уеўся ў косьци
Такой нагнаў злосьци!
Што ани ратунку!
Станавы пан, земски яще больши.
А хто гад найгорши —
Дык стражник з Заполя!
А каб яго не доля!
Былоб каму губиць свет!
А каб яго прапаў след!
Гэтаж сьвине пасвиў два роки
У нашого Петра Сароки.
З пастуха пашоў да земскаго хурманом.
Пан — стражник шишка.
А цяпер царски законом '
А каб табе спухла кишка!
Каб табе вылезли вочи,

Каб ты не меў спакою ні ў дзень, ні ў ночи!
Як ты стармасиў мяне
Як я у халоднои сядзеў праз цибе.
Набрахаў, аскаржиў, дали медаль.
Тольки што не маю стрэльбы жаль,
Але я не дарую, плясну!
Хоць паленам па мазгавицы, як у свечку ясну!
Хоць у вас таких шельмаў шмат;
Але и метуць!
Што дзень бьюць.
Пачаўши з сената,
Аж да стражникоўаго брата,
То бомбаў, то з пісталета;
Што дзень гине апалета!
Бо то гэтай драбезы и памножиў цар.
А кармиць мусиць гаспадар.
Знаким тым мужик.
А ведама: кожны з царавыхъ слуг прывык
Акром пэнси грабиць мужика.
И чим спрытнэйша рука,
Тым чины скарей идуць.
Глядзи министр ганарал!
А за што? за тое, што сказаўши па расейску
[(„варавал").
А як мужикоў, так за палена дроў
Садзяць на пяць гадоў!
Ось як нас, што не хацели гарэлки пиць
Ды падаткоў плацыць.
То так казаки зсекли,
Што ужо не будзе горш балець у пекли:
А посьле мяне и ище двох
Засадзили у астрох.

Сядзели. Алеж там рожнаго народу шмат!
Вот не раўнюючи, як у касьцели...
Тольки што праўда, так ксендзоў не нат.
Але усё таки аднаго мели.
И добрыж быў чалавек!
Не забуду век,
Як мы у цюрме рабили галодну забастоўку.
То так уси над канец маркотными стали
Што найбольш спали
Тольки ксёндз ды яще салдат,
Як запеюць „Марсыльянку", брат!
Так па niволи уси устаем
И разам песьню пяем.
После мяне випусьцили, а ксёндз дык там
З сьлезми ён са мною развитаўся [астаўся
Навучаў, прасиў, крычаў нат у след.
Не гультуй, Петрук, помни на той свет
Гани каго трэба
Бо не убачиш неба,
Бо мы табе станем сницца,
Кали не будзеш мсцицца.
Ну дык я цяпер Петрук, ратуючи душу,
Прыказане мушу
Спаўняць у лёт.
Каб тольки шрот,
Дубэльтоўку мець, писталет
Так ось пралажу след!
Наведу масты з мацерьялу,
Каб дасталося не тольки стражнику, стапавому
Але и пану генералу [земскому
Знаким тым губэрнатору нашаи губерни.

Ба 16059
Дзяржаўная бібліятэка БССР

B000000367 15 18